Ён быў ужо *там*. Дакладней, *тут*. З намі. У «ТУ-154», які разбіўся пяць гадоў назад. З усіх пасажыраў ён адзін тады выжыў.

І вось ён вярнуўся.



# ЗМЕСТ

I

Байцы нябачнага фронту .................................................. 5

*Падганяла і прымушала рызыкаваць жаданне вырваца з галечы...*

Усход – штука тонкая ....................................................... 50

*Рана ці позна пасля такіх гучных слоў і зманлівых абяцанняў павінна была згуртавацца падпольная каманда ахвотнікаў рызыкнуць сваім здароўем і грашыма. Яна і сабралася...*

Жакей ................................................................................ 81

*Спачатку Уладзіміру здавалася, што сон працягваецца. Хтосьці ў чорным, з нацягнутай на галаву панчохай, прыціскаў яму да жывата нож. Проста ў твар Уладзіміру ў гэткім жа маскарадзе дыхаў другі. У руцэ ў яго быў рэвальвер...*

Першы клас ....................................................................... 90

*Спахапіўся своечасова! Зноў паліцаі некага павялі...*

Трэцяе купэ ...................................................................... 111

*— Дайшло нарэшце! — таптаўся па маіх, цяпер ужо зусім — на жаль! — сапсутых туфлях рыжы Прапаршчык. У правым не вытрымаў, разышоўся па шве заднік. Наймаднейшыя востраносікі — паэтаву мару! — можна было выкідваць. Можна, ды нельга: у абцасе левага я схаваў неапрыходаваную валюту...*

Самы Ніжні Тагіл ............................................................ 118

*Група музыкаў (таксама эстэтаў: усё «не гони лошадей» ды «не гони-и») пайшла перадыхнуць, і амаль адразу ж сярод запанавалай цішыні пачуўся дзікі лямант:*

*— Сёння я вам зладжу, блядзі, вечар! Сёння вы ў мяне пакуляецеся!..*

Касіў Ясь ........................................................................ 149

*Сяргей рызыкаваў меней, але застаццa б і яму без галавы пры абломе. Мяне ж у выпадку залёту жыўцом падсмажылі б...*

Інтуіцыя ........................................................................ 161

*У гэты ж самы час на адным з прамежкаў трасы Брэст — Масква катамаранам, быццам склееныя, імчалі дзве машыны. Нягледзячы на каварную серабрыстасць дарогі ад першага, які толькі выпаў снегу, мікрааўтобус трымаў свае максімальныя сто шэсцьдзесят, але сіняя «дзевятка» нібы прыліпла да яго злева і саступаць не хацела...*

Фарц ........................................................................ 171

*Так, перагрузка.*

*Ён узяў болей за норму, болей, чым мог панесці. Ён хацеў дагнаць гады. Гады прастою, бяздзейнасці, адчаю. Ён не адужаў. Не змог. Не вытрываў. Зламаўся.*

*Самалёт зламаўся. Падаў. Гінуў.*

*Сашка выдыхнуў, расслабіўся, заплюшчыў вочы...*

II

А далей — дробязі ........................................................................ 181

*— Мы пойдзем іншым шляхам! — па-ленінску настаўляў мяне старэйшы таварыш, які паспеў раней пабамжавацца ў капіталюг ненасытных. — У два разы таннейшым! Галоўнае дабрацца да Згажэлец... а далей — дробязі...*

Дзевяць сутак і дзевяць гадоў ........................................................................ 184

*Машыну панесла юзам, але пярэдні прывад не падвёў, утрымаў яе на дарозе...*



Уладзівасток — самы Далёкі Усход,
або Другая спроба ........................................................................ 186

*Вам бясконца млява пасміхнуцца і па-змоўніцку ледзь чутна агучаць лічбу. Нават дзве: за гадзіну і за ноч. Лічбы будуць сціплыя, не напалохаюць: скажам, трыццаць і пяцьдзесят тых самых умоўных адзінак. Але галоўным і найдзіўным стане тое, што...*

Мост ........................................................................ 189

*«Добры горад Шаржа, — думаў я, паралізаваны новым паваротам падзей, — але лепей атаварвацца ў Дубаях...»*

Аблава ........................................................................ 193

*— Серж, — спрабаваў Санька гаварыць усё ж спакойна і ўпэўнена, — трэба ехаць, рухацца, уцякаць. Аблава — толькі пачатак. Далей кола пачне сціскацца...*

І вось ён вярнуўся... ........................................................................ 195

*Гэта быў той выпадак, калі з першых крокаў (а масць у гэтую паездку не пайшла адразу) ён вырашыў прабівацца любым коштам. Любым!*